*Т.І. Борбат*

## ПАЭТЫЧНЫЯ ПОШУКІ С. ГРАХОЎСКАГА КАНЦА 1980-ых – 1990-ых ГАДОЎ

У час перабудовы, дэмакратызацыі літаратурна-грамадскага жыцця з'явілася магчымасць гаварыць праўду, уздымаць у друку тыя тэмы, якія раней былі забаронены, – з аднаго боку, а з другога – праявіліся крызісныя з'явы: бездухоўнасць, падзенне ўзроўню культуры і маралі (таксама праўда нашай эпохі, якую *"сумленная літаратура не мае права замоўчваць"*) [4. С. 235]. Л. Гарэлік слушна заўважае, *"што з сярэдзіны 80-х гадоў паэзія і проза С. Грахоўскага набываюць адзнакі новага мыслення, пазбаўленага стэрэатыпнай абмежаванасці"* [1. С. 237]. Паэт пераасэнсоўвае сваю творчасць, перарабляе раней напісанае: *"З сабою вёў заўсёды спрэчкі і выдаў вершаў два тамы"* [2. С. 112]. Цяпер ён паўстае іншым, суровым, часам жорсткім, яго чалавечая і грамадзянская пазіцыя адназначная: *"Без праўды можна існаваць, // А жыць без праўды немагчыма"* ("Немагчыма" [2. С. 195]). С. Грахоўскі выступае пераважна як публіцыст, палеміст ("Балючае", "Тармазы", "Вечная памяць", "А ён яшчэ жывы", "Гісторыя").

Мастак запрашае ў сведкі і субяседнікі *"думнае веча пражытых гадоў"*, яму ёсць што сказаць чытачу. Яго *"незваротная памяць"* вядзе па *"сыпкіх сумётах"* туды, *"дзе шалёная замяць шуміць і шуміць па сцяне"*, дзе яго *"пакаленне вышыняў сваіх не здало"* (Зб. "Сонечны вечар"). Загінулі вялікія людзі, а слова іх засталося: *"Здавалася, што ўсё пайшло на глум, – // Старонкі датлявалі, як палова, // Палалі Жанна д'Арк і Авакум, // Але ні разу не сатлела слова"* ("Спаленыя кнігі" [2. С. 133]).

Паэт не можа не ўспомніць і сваіх сяброў-паэтаў, свае і іх асуджаныя кнігі. Апошняя страфа верша яшчэ больш узмацняе эмацыянальнае гучанне твора, дзе аўтар робіць выснову: *"Невінаватых можна пакараць // Ці стрэлам абарваць пачатак песні, // Асуджаныя ж кнігі не гараць: // Радок сатлее – ісціна ўваскрэсне"* [2. С. 134]. Важную ролю ў гэтых творах адыгрывае іронія, што вырастае з горкага ўсведамлення супярэчнасці паміж марамі і жорсткімі рэаліямі жыцця, паміж словам і справай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

С. Грахоўскі з жалем жартуе, што жывём мы ў *"краіне дзіўных цудаў, // Як у храме на крыві, // Алкаголікаў і юдаў, <...> // Век пакутуй, а жыві"* ("У краіне цудаў" [2. С. 256]). Парасткі таталітарнай сістэмы вельмі глыбока ўкараніліся ў сацыяльнае жыццё, яны ў хлусні, страце сумлення, падазронасці, хабарніцтве, кар'ерызме, бюракратызме, нядбайным кіраўніцтве ("Сумленне", "Хлусня", "Камуналка", "Балючае", "Чароўныя да́мы", "Чынадралы"). І невядома, дакуль будуць панаваць несправядлівасць, прадажніцтва, здрада. Застаецца толькі спадзявацца, што шчырых і сумленных людзей на свеце больш за гэтых "пачвараў чалавечага існавання".

Пісьменнік не можа зразумець, *"як церпіць бедная Зямля // Людскія і свае пакуты"*. Гэта пытанне неаднойчы зрывалася з вуснаў сумленных людзей. І як тут не звернешся да Бога, калі невядома, што далей рабіць і на каго спадзявацца. Вера ў народзе заўсёды жыла, хоць "маральныя калекі" яе ўсяляк імкнуліся вынішчыць. У творы паэт уздымаецца да філасофскага разумення псіхалогіі сучасніка, шукае ісціну праз аналіз падзей мінулага, што выяўляюць светаўспрыманне і светаадчуванне паэта: *"Патухлі свечкі і лампады, // Калі ў будзёнаўках чыны // <...> Дадолу скінулі званы. <...> // І ачмурэлыя калекі // Ператварылі храм у склад"* ("Вячэрні звон" [2. С. 252]).

А што можа натварыць чалавек, калі ў яго сэрцы няма Бога, паказала гісторыя. "Бог і Боскае ў душы чалавека – вось тое, што здольна перайначыць грамадскае жыццё", – сцвярджае паэт. І менавіта з разбурэннем штучных ідэалаў, адыходам атэістычнай дагматыкі, усяго наноснага і штучнага пачаўся пошук сучаснікамі сапраўднай маральна-духоўнай апоры. Храм для паэта – увасабленне чысціні, святасці роднай зямлі, годнага ўладкавання свету: *"Пад купалам анёлаў цені // Ў аблоках ладану плылі // І наступала ачышчэнне, // Здавалася, на ўсёй зямлі <...>"* [2. С. 251]. Аўтар даводзіць, што шлях да Бога вымагае ачышчэння, пакаяння і веры. Верш заканчваецца, дарэчы, як і пачынаецца, радкамі элегічнымі, роздумнымі, якія сведчаць пра боль лірычнага героя, яго пакуты, гатоўнасць да самаачышчэння. Такое паяднанне ў творы публіцыстычнага пафасу і элегічнага настрою стала характэрнай асаблівасцю паэзіі С. Грахоўскага канца 80–90-ых гадоў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У гэтыя ж гады нарастаюць іронія, сарказм. Возьмем для прыкладу верш "Чароўныя да́мы." Гэта твор пра жанчын, якія набылі мужчынскія постаці, пра дам, якія выконваюць мужчынскую работу, а таму страцілі сваю чароўную жаноцкасць: "*На адказнейшых работах // З ломам, тачкаю, кайлом // Завіхаюццаназлом*" [2. С. 259]. Як дэфармавана, як зняважана жанчына: "*Ці не раннія маршчыны шчокі вам размалявалі, // Каб нідзе не забывалі // Кожны дзень рабіць да поту // Ганаровую работу*" [2. С. 260]. І як насмешка з таталітарнага ладу гучаць радкі: "*А за гэта да жылетаў // Вам прышпіляць медалі, // Што шчаслівы Край Саветаў // Так высока вы ўзнялі*" [2. С. 260]. Аўтару ўдалося так разгарнуць сцэну, падаць карціну, якая дапамагае стварыць адпаведную сутнасці з'яў настраёвасць. Твор насычаны пачуццём, глыбокім і выбуховым.

Зборнік вершаў "На апошняй вярсце" ў большай меры насычаны лірызмам, чым папярэднія зборнікі: пераважаюць лірычныя маналогі, элегіі, споведзь лірычнага героя, які адчувае сябе няўтульна ў гэтым неўладкаваным свеце ("Адзінота", "Асуджаны на мукі з нараджэння", "Прызнанне"). Пачуццё адзіноты не пакідае паэта на працягу ўсёй кнігі: "*Як праклята, баюся нямой адзіноты, // Безгалосся, бязгучча, застылай цішы* <...>" ("Адзінота" [2. С. 248]). Перадаць тужлівы стан душы героя аўтару дапамагаюць трапныя мастацкія дэталі, "міні-вобразы" (М. Мішчанчук), якія нараджаюцца па прынцыпе падабенства ці адухаўлення нежывога: "*адзінокая дзічка*", "*пусты сасоннік*", "*застылая ціш*", "*Венера над полем*", "*расінкі спадаюць, як ноты*" *і інш.*

Лірыка-публіцыстычны стыль вершаў паэта шматгранны: ён сінтэзуе ў сабе і рамантычны пачатак, і апавядальна-размоўную інтанацыю, і сатырычную накіраванасць. Такі сінтэз абумоўлены тым, што паэзія С. Грахоўскага ўзнімаецца да анталагічных праблем быцця, мастак ахоплены жаданнем пазнаць свет, адчуць яго прыгажосць, зразумець таямніцы светабудовы.

Адметнай паэтычнай з'явай 90-ых гадоў стаў зборнік вершаў "Недапісаная кніга" (1996), выдадзены паэтам да 83-годдзя сваёй творчасці[1].

[1] Шматлікія вершы з гэтага зборніка спярша друкаваліся ў перыядычных выданнях, затым, дапрацаваныя, склалі змест гэтай паэтычнай кнігі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Першы раздзел кнігі вершаў называецца "Лірычная памяць". У ім паэт нібы падводзіць вынік усяму свайму жыццю: "*Імкліва бягуць за гадамі гады, // Як позні горкія слёзы* <…>"; аўтар акрэслівае "маральную мяжу", да якой падышло наша грамадства: "*Пусцеюць душы і пусцеюць паркі*"; гэтымі словамі выразна ўдакладняецца ідэйная пазіцыя аўтара, несумяшчальная з двурушніцтвам, кар'ерызмам, прыстасавальніцтвам.

Лірычная памяць паэта ўбірае ў сябе юнацкія гады ("Майму інстытуту", "Равесніца", "Незваротнае", "Ваганні"), успаміны аб сустрэчах з каханай ("Сцюдзёная ноч", "Белы бэз", "На Пцічы", "Чаромхавы чад", "Твае далоні пахнуць першым снегам"). Увогуле для кнігі характэрна ўвага да "экалогіі пачуццяў, экалогіі кахання" чалавека.

Вершы на тэму кахання разнастайныя і па форме, і па змесце, па інтанацыі і філасофскім падыходзе. Яны вызначаюцца глыбінёй падтэксту, выразнасцю псіхалагічнага малюнка, драматызмам. Часам умоўна-сімвалічны і рэальны планы пераплятаюцца, дапамагаючы перадаць стан душы лірычнага героя ("Каля вогнішча", "На шыбах – белыя лілеі", "На Пцічы"). Адлюстроўваючы шматлікія адценні пачуцця, аўтар шукае адметныя сітуацыі, псіхалагічныя ўзроўні.

Каханне – цуд, таямніца, дар божы, яно сведчыць пра маладосць і жыццёвую сілу чалавека. У глыбока лірычных творах мастак не саромецца шчырасці пачуцця: "*Я трацію і развагу, і спакой, // Пачуўшы голас ціхі і спакусны, // Лавію руку гарачаю рукой // І вуснамі – асмужаныя вусны*" ("Салаўіная ноч" [3. С. 30]).

Праўда, у шматлікіх вершах С. Грахоўскага пра каханне гучаць і восеньскія мелодыі незваротнасці, няўмольнасці часу, усеразбуральнага і абыякавага ў сваёй адвечнай хадзе: "*Пастой… Паслухаем і пазайздросцім, // Пакуль праменьчык радасці не згас // Бяздумнай і вясёлай маладосці, // Якая больш не вернецца да нас*" ("Твае далоні пахнуць першым снегам…" [3. С. 21]). Таму жыццё набывае асаблівую каштоўнасць і сэнс, дорыць у каханні ўзаемную асалоду пачуццяў і перажыванняў.

Здольнасць любіць жыццё, людзей, прыроду выпакутавана лірычным героем. Любоў для яго – гэта перш за ўсё цяжкая душэўная праца, з яе падзеннямі і ўзлётамі, набыткамі і стратамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мэта паэзіі, у разуменні С.Грахоўскага, – гэта сцвярджэнне і захаванне духоўных каштоўнасцей, няхай нават насуперак асабістаму шчасцю і спакою: *“Боль за сябе і за народ // Скалечыў і маю душу, // Таму ўжо каторы год // Крывёю ўласнаю пішу, // Пакутую, але не лгу...”* (“Прадмова” [3. С. 163]). Сум і душэўны боль, як правіла, суправаджаюць творчасць, робяць чалавека праніклівым, дапамагаюць супрацьстаяць сытасці і самазаспакаенню. Лірычны герой С. Грахоўскага бязлітасна судзіць сябе, калі заўважае прыкметы самазадавальнення: *“Жыццё ўсяго адно, і часу мала, // Таму спяшайся і пішы, пішы”* [3. С. 131].

Даверлівай і ўсхваляванай інтанацыяй, тонкім разуменнем чалавека, яго сувязей з жыццём, прыродай, псіхалагічнай дакладнасцю і лаканізмам выражэння душэўных зрухаў пазначаны і вершы “Фінал”, “Аўтаэпітафія”, “Скарб”. У гэтых і многіх іншых творах С. Грахоўскі па-майстэрску перадае адчуванне хуткаплыннасці жыцця, сумненні ў дасягнутых імкненнях і ідэалах, таму з кожным годам узрастае жаданне знайсці новыя шляхі, каб спець сваю лепшую песню: *“Так з ночы ў ноч караю і караю // Сваю недасканалую душу, // Усё, што непакоіць, паўтараю, // А раніцай, як споведзь, запішу”* (“Неспакой” [3. С. 234]). Знешне спакойная, ураўнаважаная інтанацыя падкрэслівае глыбокі трагізм таго, што адбываецца ў паэтавай душы.

Вершы С. Грахоўскага апошніх год напоўнены схаваным драматызмам ад адчування “апошняй вярсты” (“Журавы”, “Неюбілейны”, “Мае радкі”, “Мара”, “Прычына”). Стан душы лірычнага героя, увесь яе боль, выкліканы жыццёвымі расчараваннямі і роздумамі аб смерці, дапамагаюць перадаць часцей за ўсё афарыстычна арганізаваныя пытальныя сказы: *“Куды мне дзецца ад тугі // І ў каго знайсці спагаду. // Як вузел развязаць тугі, // Што зблытаў і любоў, і здраду?”* [3. С. 127].

Драматызацыя лірыкі знаходзіць не толькі змястоўнае, а і фармальнае выяўленне ў выглядзе вершаў-дыялогаў (“Бежанцы”, “Апошняя”). Напрыклад, на сутыкненні кантрастных пачаткаў пабудаваны верш “Бежанцы”:

– Куды бяжыце, бежанцы, куды?
– Ад горкай да крывавае бяды,
– Адкуль бяжыце вы, адкуль?
– Ад полымя і ад шалёных куль [3. С. 191].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларусы-бежанцы амаль стагоддзе шукаюць сваю долю. Як і купалаўскія паязджане ("Паязджане"), яны маюць змрочнае мінулае, бягуць ад сучаснасці і не бачаць будучыні: "*Хутчэй прытулак знойдзем на кладах*". Дыялагічная форма верша надае асаблівую выразнасць паэтычнай думцы, дазваляе зліць голас паэта з галасам народа.

У другім раздзеле кнігі – "Балючыя элегіі" – мастак працягвае даследаванне нашага напружанага жыцця. Вострыя праблемы часу, жахлівыя катастрофы ўспрымаюцца паэтам як глыбока асабістыя ("Расплата", "Гулікі", "Апошняя", "Каму мы трэба?"). Суб'ектывізм іх успрымання падкрэсліваецца характэрнымі лірыка-публіцыстычнымі радкамі: "*Не ведаю, куды і як ісці: // За небасхілам дым і шал крывавы, // І дзеці ўжо не мараць аб жыцці, <...>*" ("Трывога трывог" [3. С. 195]). Яркая вобразнасць, страсная эмацыянальнасць, гістарызм мыслення спалучаюцца ў творы ў адзінае цэлае, прасякнутае публіцыстычным гучаннем.

Многія творы гэтага цыкла маюць выразныя адбіткі эпасу. Ліра-эпічнымі ўяўляюцца нам вершы "Век", "Змена – змене", "Вечныя". Гэта вершы-апавяданні, балючыя занатоўкі пра сённяшні час.

С. Грахоўскі з гнятлівасцю, горыччу і трывогай гаворыць пра катастрафічнасць існавання чалавека, усвядомлена пратэстуе супраць антыдухоўнай, антычалавечай стыхіі, што захліснула свет. Гуманізм, дабрыня, справядлівасць, свабода і роўнасць усіх людзей – арыенціры паэта. Таму ён усёй душой не прымае "*практыку дзікага капіталізма*", нажывы, пратэстуе, выкрывае псеўдадэмакратаў, чыноўнікаў, бачыць новых каралёў, якія "*махлярствам і страчаным сумленнем,* "*як ліпку, абдзіралі свой народ*" [3. С. 165]. Адбылася сацыяльная мімікрыя: былыя камуністы, высокага рангу чыноўнікі зрабіліся капіталістамі, сярод іх і тыя "*марксізму дактары навук і кандыдаты*", якія хутка перабудаваліся: "*Прызначылі народных дэпутатаў // І тыя рушылі зацята на народ, // Абы рабіць усё наадварот*" ("У сацлагеры" [3. С. 204]).

З горкай іроніяй паэт звяртаецца да "*пакутнікаў за народ*", што "*Не бачаць нашае бяды, // За ўладу грызучыся ў цытадэлі*" [3. С. 247]. Кожная страфа верша паглыбляе паказ драматычнага становішча беларусаў. І як крык душы паэта ўспрымаюцца радкі: "*О, дзікі свет! Скажы, каму паверыць? // З якімі прайдзісветамі ісці? <...>*" [3. С. 248].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Шматлікія звароты, выгукі, вульгарызмы, яркія метафары дапамагаюць перадаць душэўны боль лірычнага героя.

Клопатам мастака за будучае Радзімы і будучае нацыі вызначаюцца лірычныя маналогі ("Надзейны старт", "Дарэмны крык", "У сацлагеры", "Весела жывём", "Безназоўныя элегіі" і інш.). Голас паэта гучыць як голас усіх сумленных людзей краіны. Апошні лірычны зборнік С. Грахоўскага цалкам прасякнуты элегічным настроем.

У сваіх творах паэт падсумоўвае зробленае, разважае пра немінучую канчатковасць зямнога шляху, пра смерць. Паглыбляецца філасофскі падыход мастака да ацэнкі з'яў і ўчынкаў людзей. Часам яго цікавяць сітуацыі "памежжа", "пагранічча" – сітуацыі, якія, паводле высноў А. Бельскага, І. Чароты, М. Мішчанчука, з'яўляюцца характэрнымі для беларускага менталітэту: "*Шукаю, клічу, варажу я, // Наіўна веру, як дзіця, // А лёс шляхі мае крыжуе // На стыку смерці і жыцця*" ("На стыку смерці і жыцця" [3. С. 172]). Душа паэта знаходзіцца на мяжы жыцця і смерці, веры і бязвер'я, святасці і грахоўнасці. Сумленне дакарае пісьменніка, яно выступае ў якасці "*справядлівага суддзі, што ацэньвае вынікі і грамадзянскую значнасць дзейнасці*" [5. С. 321].

Трагічнымі матывамі, адчуваннем разломнасці "*дзікага стагоддзя*", перажываннем страты ранейшых каштоўнасцей прасякнуты "Безназоўныя элегіі", а таксама вершы, змешчаныя на старонках часопісаў "Полымя" ("У натоўпе", "Мільянер", "Пакаянне"; 1998, № 9; "Мяне хрысцілі чорныя маланкі"; 1999, № 8); "Маладосць" ("Пах чабору мяты", "Раскіданае гняздо"; 1998, № 8); "Беларусь" ("Стыхіі", "На сконе веку"; 1998, № 9; 2000, № 1). Гэтыя і многія іншыя творы выразна перадаюць настрой паэта, які расчараваўся ў жыцці, сабе і людзях. Цэнтральныя вобразы-сімвалы медытацый С. Грахоўскага – "*нябыт*", "*грозныя сузор'і*", "*сляпая завіруха*", "*апошні снег*" – таксама сведчаць пра трагедыйнасць светаўспрымання паэта ў апошнія гады.

Акрамя таго, многія вершы змяшчаюць у сабе супрацьлеглыя, палярныя сітуацыі, пачуцці. Усё гэта прыводзіць да паяднання ў адным творы радаснага і сумнага настрою, апісальнасці і філасафічнасці, праяў оды і элегіі ("Размова з помнікам", "Мой народ", "Пад небам Беларусі"): "*Хацеў накінуць на сябе пятлю, // бо змогся ад жыцця такога <...>*" [3. С. 224]. Далей



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інтанацыя твора мяняецца. У вершы з'яўляецца вобраз-сімвал сонца, якое абудзіла не толькі прыроду, а і веру лірычнага героя ў лепшы час для краіны: "<...> *Як ні горка, трэба жыць // У Беларусі і для Беларусі*".

Стылявымі асаблівасцямі паэзіі С. Грахоўскага апошніх год становяцца грамадзянская палкасць, публіцыстычнасць, часам вострая іронія, бескампраміснасць у дачыненні да любых праяў зла і адначасова глыбокі лірызм і філасафічнасць.

Такім чынам, матыў неадплатнага абавязку перад людзьмі, бязлітаснага патрабавання да сябе выходзіць ў паэзіі С. Грахоўскага канца 80–90-х г. на першае месца. Не страчваючы грамадзянскага пафасу, лірыка паэта ўсё глыбей адлюстроўвае супярэчлівы стан яго душы: сумненні ў сабе, жаданне набыць новыя, невядомыя дасюль сувязі са светам. Ускладненасць філасофска-эстэтычнага пошуку адточвае паэтычную форму С. Грахоўскага. У жанравай сістэме паэта сцвярджаецца лірычная мініяцюра, лірычны маналог, элегія, у якіх выражаецца глыбокі роздум мастака слова над праблемамі часу. Стыль пісьма стаў сінтэтычным: у творах адначасова спалучаюцца публіцыстычнасць, іронія і філасофскі роздум, падсвечаны элегічным настроем.

**Літаратура:**

1. *Гарэлік Л.* Прапаведзь дабра // Полымя. – 1994. – № 2.
2. *Грахоўскі С.* Выбраныя творы: У 2-х тт. – Мінск: Маст. літ., 1994. – Т. 1: Вячэрні звон: Вершы, паэмы.
3. *Грахоўскі С.* Недапісаная кніга: Вершы. – Мінск: Маст. літ., 1996.
4. *Дзюбайла П.* Час страчаных ілюзій // Полымя. – 1993. – № 11.
5. *Шпакоўскі І.С.* Самаўдасканаленне: Ідэйна-стылявая эвалюцыя паэзіі П. Панчанкі // Мішчанчук М.І., Шпакоўскі І.С. Беларуская літаратура XX ст.: Вучэб. дапам. – Мінск: Выш. школа, 2001.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова